

# МУЗЕЯЗНАЎСТВА

УДК 069:351.853-027.21

*І. І. БАМБЕШКА*

## ЭВАЛЮЦЫЯ, ЗМЕСТ І СУТНАСЦЬ ПАНЯЦЦЯ «КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА»

*Высвятляюцца актуальныя пытанні культурнай спадчыны. У прыватнасці, значная ўвага надаецца зместу і сутнасці паняцця «культурная спадчына». Аўтар вывучае працэс эвалюцыі паняцця, праводзіць гістарыяграфічны аналіз праблемы яго вызначэння. Выбар тэмы абумоўлены адсутнасцю падобных даследаванняў у беларускай навуковай практыцы.*

Культурная спадчына складае ўласнасць кожнай краіны, рэгіёна, этнічнай групы, што дазваляе апошняй пазнаць сябе, зацвердзіць сваю супольнасць, даказаць жыццяздольнасць у соцыуме. Культурная спадчына фактычна ўяўляе спосаб існавання культуры, з'яўляецца яе фундаментам. Тое, што не ўваходзіць у культурную спадчыну, перастае быць культурай і ў рэшце рэшт спыняе існаванне.

Цікавасць да помнікаў нацыянальнай культуры з найбольшай вастрынёй узрастае ў пераломныя моманты гісторыі, калі грамадства спрабуе пераасэнсаваць мінулае і зазірнуць у будучыню. У нашай краіне так адбывалася на мяжы XVIII–XIX стст. і ў канцы XIX – пачатку XX ст. Не стала выключэннем і мяжа XX і XXI стст., калі ў чарговы раз назіраецца ўзмацненне цікавасці да айчыннай гісторыі і культуры, актывізуюцца даследаванні ў акрэсленай галіне, адбываецца новы ўздым краязнаўства. Вывучэнне «белых плям» гісторыі, вяртанне беспадстаўна забытых і выкрэсленых імёнаў, публікацыя раней невядомых дакументаў і твораў літаратуры, шырокая дэманстрацыя твораў мастацтва з фондаў музеяў і прыватных калекцый – гэта толькі першыя крокі да ўспрымання і ўсведамлення духоўнага вопыту нашых папярэднікаў, лепшых традыцый і ўзораў культуры. Усё пералічанае сведчыць аб фарміраванні новага этапу ў асэнсаванні культурнай спадчыны.

Сутнасць паняцця *культурная спадчына*, нягледзячы на актыўнае яго выкарыстанне, недастаткова поўна вывучана ў філасофскім, гістарычным і культуралагічным аспектах, паколькі традыцыйна праблема культурнай спадчыны разглядалася галоўным чынам у кантэксце захавання помнікаў мінулага.

На цяжкасці, звязаныя з вызначэннем культурнай спадчыны, звяртаюць увагу многія даследчыкі. Так, спецыяліст ЮНЕСКА прафесар Ліндэл В. Прот адзначала, што ў той час як эксперты культуры ў розных сфе-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рах маюць дастаткова яснае ўяўленне аб прадмеце свайго даследавання, афіцыйнае вызначэнне культурнай спадчыны – адно з самых складаных месцаў для навукоўцаў [14]. Сапраўды, даць вызначэнне феномена *спадчына* і звязанаму з ім колу тэрмінаў не менш складана, чым ахарактарызаваць саму культуру. Разнастайнасць трактовак культурнай спадчыны звычайна дэтэрмінуецца тым, што маюць на мэце даследчыкі-тэарэтыкі ці спецыялісты-практыкі.

Само паняцце *спадчына* (наследие, patrimonium) у рымскім праве мела дачыненне да ўсёй маёмасці, якая была атрымана ў спадчыну; маёмасць, што па закону наследавалася дзецьмі ад бацькоў; сямейная маёмасць як проціпастаўленне маёмасці, набытай пасля шлюбу. Па аналогіі пазней з'явіліся метафарычна ўжываемыя тэрміны: *генетычная спадчыннасць*, які нядаўна ўзнік для апісання атрыманых у спадчыну рыс жывой істоты, і *культурная спадчына*, які з'явіўся ў XVII ст. і больш актыўна пачаў ужывацца пасля Французскай рэвалюцыі. З-за этымалогіі гэты тэрмін і заключанае ў ім паняцце heritage з 1930-х гг. былі больш распаўсюджаны ў раманскіх мовах, чым у англа-саксонскіх, дзе аддавалася перавага тэрміну *property (goods) / собственность (имущество) / уласнасць (маёмасць)* да прыняцця паняцця heritage ў 1950-я гг. Пры гэтым heritage (наследие) адрознівалі ад legacy (наследство) [5, с. 59].

Ідэя спадчыны непазбежна была звязана з патэнцыяльнай стратай ці знікненнем маёмасці, што адбывалася ў час Французскай рэвалюцыі, і адначасова з жаданнем захаваць яе. Пачынаючы са згаданых падзей і на працягу XIX ст. паняцце спадчыны ў асноўным ужывалася ў дачыненні да нерухомай маёмасці, і, як правіла, змешвалася з разуменнем гістарычнага помніка. Нават пасля таго, як пад эгідай ЮНЕСКА і дзякуючы дзейнасці ICOMOS ідэя спадчыны распаўсюдзілася па свеце, яна перш за ўсё ахоплівае помнікі, групы помнікаў і памятныя мясціны. У адпаведнасці з Канвенцыяй ЮНЕСКА «Аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны» (1972) да культурнай спадчыны адносяцца помнікі: творы архітэктуры, манументальнай скульптуры і жывапісу, элементы ці структуры археалагічнага характару, надпісы, пячоры і групы элементаў, якія маюць выдатную ўніверсальную каштоўнасць з пункту гледжання гісторыі, мастацтва ці навукі; ансамблі: групы ізаляваных ці аб'яднаных пабудоў, архітэктура, адзінства ці сувязь з пейзажам якіх уяўляюць выдатную ўніверсальную каштоўнасць з пункту гледжання гісторыі, мастацтва ці навукі; памятныя мясціны: творы чалавека ці сумесныя творы чалавека і прыроды, а таксама зоны, уключаючы археалагічныя памятныя мясціны, якія ўяўляюць выдатную ўніверсальную каштоўнасць з пункту гледжання гісторыі, эстэтыкі, этналогіі ці антрапалогіі [7, с. 291].

Разам з тым прыкладна ў канцы 1940-х – 1960-я гг. культурная спадчына як тэрмін і праблема ўвайшла ў навуковы ўжытак, што было звязана з працэсамі аднаўлення помнікаў пасля Другой сусветнай вайны. Паступова ўсе матэрыяльныя сведчанні чалавека і яго асяроддзя пачалі аб'ядноўвацца ў агульнае паняцце спадчыны.

У рамана-германскай моўнай традыцыі спадчына – гэта частка матэрыяльнай і духоўнай культуры, створаная мінулымі пакаленнямі, якая вытрымала выпрабаванне часам і перадаецца пакаленням як нешта каштоў-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нае і ўшанаванае. У навуковай практыцы франкамоўных краін спадчына характарызуецца як сукупнасць прадметаў ці груп прадметаў, матэрыяльных ці нематэрыяльных, якія прызнаюцца грамадствам ці вылучаюцца за кошт іх каштоўнасці як сведчанне і гістарычная памяць і заслугоўваюць быць абароненымі, захаванымі ці замацаванымі. Гэта паняцце мае дачыненне да ўсіх прыродных ці зробленых чалавекам прадметаў і каштоўнасцей, матэрыяльных ці нематэрыяльных, без абмежавання ў часе ці прасторы, былі яны атрыманы ў спадчыну ад папярэдніх пакаленняў ці сабраны і захаваны для перадачы нашчадкам [5, с. 61].

У агульным выглядзе культурная спадчына характарызуецца як з'ява культуры, побыту, ладу жыцця, атрыманая ў спадчыну ад папярэдніх эпох, ад нашчадкаў. Такое вызначэнне культурнай спадчыны прыводзіцца ў тлумачальным слоўніку рускай мовы пад рэдакцыяй С. І. Ожэгава [12, с. 592].

Прыкметны ўклад у распрацоўку культурнай спадчыны як асаблівай катэгорыі ўнёс савецкі філосаф Э. А. Балер, які яшчэ ў канцы 1960-х – 1980-я гг. правёў найбольш грунтоўны аналіз вывучаемай з'явы. Ён прапанаваў сваё разуменне культурнай спадчыны ў шырокім сэнсе слова як сукупнасці сувязей, адносін і вынікаў духоўнай вытворчасці мінулых гістарычных эпох, а ў больш вузкім – сукупнасці культурных каштоўнасцей, якія засталіся чалавецтву ў спадчыну ад мінулых эпох і падлягаюць крытычнай ацэнцы і перагляду, развіццю і выкарыстанню ў адпаведнасці з канкрэтна-гістарычнымі задачамі сучаснасці, на аснове аб'ектыўных крытэрыяў грамадскага развіцця [2, с. 56]. У далейшым падобнае вызначэнне культурнай спадчыны стала падставай для наступных характарыстык паняцця.

Сёння культурная спадчына трактуецца як базавае паняцце культуралогіі і музеязнаўства і характарызуецца, па-першае, як сукупнасць сувязей, адносін і вынікаў духоўнай дзейнасці мінулых гістарычных эпох, а па-другое – сукупнасць аб'ектаў навакольнага свету, якія прызнаюцца культурнымі каштоўнасцямі на аснове культурнага вопыту чалавецтва [4]. Вызначэнне культурнай спадчыны ў вузкім сэнсе супадае з характарыстыкай культурнай спадчыны, прапанаванай Э. А. Балерам.

Агульнапрынятае і дэталёвае вызначэнне культурнай спадчыны адлюстравана ў шэрагу міжнародных прававых дакументаў (напрыклад, у згаданай Канвенцыі 1972 г.). Аднак падобная характарыстыка прымальна для вызначэння ўнутранай будовы і можа ўжывацца хутчэй з утылітарнымі мэтамі, звязанымі з прававымі і маёмаснымі адносінамі, паколькі не адлюстроўвае ролю і месца з'явы ў сучасным грамадстве.

На нашу думку, культурная спадчына ўяўляе надзвычай складаную сацыякультурную сістэму. Яна падпарадкавана сінергетычным законам, актыўна ўзаемадзейнічае з навакольным асяроддзем і перадае пэўную інфармацыю, якая змяняецца ў часе і прасторы. Спадчына ўваходзіць у мегасістэму самой культуры і, з аднаго боку, з'яўляецца адной з характарыстык і спосабаў разгляду самой культуры, а з другога – яе фундаментам, своеасаблівай «памяццю». Менавіта спадчына ляжыць у аснове інфармацыйных кодаў, якія забяспечваюць назапашванне і перадачу інфармацыі ў чалавечай цывілізацыі. Такім чынам утвараецца сістэма ўзаемасувязі па-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

між культурай, чалавекам і інфармацыяй, функцыянаванне якой і дазваляе ўзнаўляць і ўдасканальваць дасягненні культуры для новых пакаленняў [11, с. 252].

На інфармацыйны складнік як базавы кампанент спадчыны звяртае ўвагу і расійская даследчыца, супрацоўніца Расійскага НДІ культурнай і прыроднай спадчыны М. Я. Куляшова. На яе думку, спадчыну можна разглядаць як інфармацыйны патэнцыял, увасоблены ў з'явах, падзеях, матэрыяльных аб'ектах, які неабходны чалавецтву для развіцця і захоўваецца для перадачы будучым пакаленням. Узнаўленне і захаванасць – абавязковыя атрыбуты пазітыўнай спадчыны [8, с. 41]. Характарызуючы спадчыну як інфармацыю, неабходна дадаць, што апошняя прадугледжвае не толькі і не столькі пералік ведаў і звестак, а азначае сукупную памяць чалавецтва і прыроды аб з'явах матэрыяльнага і духоўнага жыцця, якая фіксуецца ў шматлікіх яго праявах, – ад кадзіроўкі генаў і асноўных жыццязабяспечваючых працэсаў да выпрацоўкі філасофскіх, маральных, этычных катэгорый і іх фізічнага ўвасаблення ў творах мастацтва, формах ландшафту, побыту і інш.

Інфармацыйна-часавы аспект у вызначэнні паняцця спадчыны падкрэсліваў вядомы савецкі і расійскі вучоны, грамадскі дзеяч Д. С. Ліхачоў у падрыхтаваным ім праекце Дэкларацыі правоў культуры. Пад культурнай спадчынай ён разумеў форму замацавання і перадачы сукупнага вопыту чалавецтва. Пры гэтым у адпаведнасці з тагачасным разуменнем структуры культуры ён вылучаў два яе складнікі: духоўны (мова, ідэалы, традыцыі) і матэрыяльны (музейныя, архіўныя, бібліятэчныя фонды, помнікі архітэктуры, ансамблі, памятныя мясціны і іншыя сведчанні гістарычнага мінулага, унікальныя ландшафты, сумесныя творы чалавека і прыроды, сучасныя збудаванні, якія ўяўляюць асаблівую каштоўнасць з пункту гледжання гісторыі, мастацтва ці навукі) [10, с. 29–37].

Прааналізаваўшы асноўныя характарыстыкі, якія могуць быць вылучаны для вызначэння культурнай спадчыны, спецыялісты Расійскага НДІ культурнай і прыроднай спадчыны прапанавалі сваё вызначэнне паняцця як нечага цэласнага, якое валодае інфармацыйным патэнцыялам, неабходным для развіцця і перадачы будучым пакаленням. На думку вядомага расійскага вучонага, супрацоўніка згаданай установы Ю. А. Вядзеніна, культурная спадчына – гэта тое, што з'яўляецца каштоўнасцю і часткай нацыянальнага багацця; яна можа разглядацца як адзін з важнейшых рэсурсаў, якія ўплываюць на наступнае развіццё грамадства, краіны, рэгіёна [3, с. 7].

Паколькі культура ўсё часцей трактуецца як адна з падстаў развіцця інфармацыйнага грамадства, то лагічным і зразумелым з'яўляецца падобны падыход і да культурнай спадчыны. Усё больш узрастае яе роля як аднаго з напрамкаў у рэгіянальнай, рэспубліканскай і міжнароднай палітыцы. Даволі часта яна становіцца падставай для ўстойлівага развіцця таго ці іншага рэгіёна ці краіны.

У айчыннай культурнай палітыцы, навуковай традыцыі, у музейнай справе, у прыватнасці, доўгі час культурная спадчына ўспрымалася практычна як сінонім тэрміна *помнік*. Так, у першай нацыянальнай энцыклапедыі суверэннай Беларусі, якая пачала выдавацца ў 1996 г. і з'яўляецца ўні-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

версальным сістэматызаваным даведнікам па ўсіх галінах ведаў на беларускай мове, адсутнічаюць артыкулы «Спадчына» і «Гісторыка-культурная спадчына». У той жа час падаюцца артыкулы «Помнік» і «Помнік гісторыі і культуры». Характарызуючы помнік, Л. Г. Лапцэвіч адзначае, што ў шырокім значэнні гэта аб'ект, які з'яўляецца часткай культурнай спадчыны краіны, народа, чалавецтва [9, с. 504]. Разам з тым дэфініцыя *помнік* перш за ўсё арыентуецца на захаванне памяці, яна выключана з актыўнай гаспадарчай дзейнасці. Спадчына ж, наадварот, гэта тое, што перадалі нам нашы продкі, але перадалі не проста на захаванне, а для інтэрпрэтацыі і прымнажэння [11, с. 253]. Такім чынам, можна меркаваць, што, па-першае, помнік суадносіцца са спадчынай як частка і цэлае, а па-другое, у адрозненне ад помніка, які з'яўляецца катэгорыяй недынамічнай, аб'ект спадчыны – частка цэласнай і актыўнай сістэмы.

Для нашай краіны паняцце *культурная спадчына* з'яўляецца дастаткова маладым. Рэспубліка Беларусь як член ААН і ЮНЕСКА ратыфікавала асноўныя канвенцыі ЮНЕСКА ў сферы аховы культурнай спадчыны: Канвенцыя аб ахове культурных каштоўнасцей у выпадку ўзброенага канфлікту (1957), Канвенцыя аб мерах, накіраваных на забарону і папярэджванне незаконнага ўвозу, вывазу і перадачы права ўласнасці на культурныя каштоўнасці (1988), Канвенцыя аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны (1988) [6]. Таму ў Беларусі ўсё большае распаўсюджанне набываюць міжнародныя тэрміны, сярод якіх і культурная спадчына (англ. cultural heritage).

На працягу апошніх дзесяцігоддзяў у нашай краіне былі распрацаваны нарматыўна-прававыя акты ў сферы аховы і выкарыстання гісторыка-культурнай спадчыны, падрыхтаваны вучэбныя і навуковыя выданні па ахове культурнай спадчыны[1], матэрыялы па афармленні дакументаў для ўключэння аб'ектаў у Спіс сусветнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА[2], праграмы падрыхтоўкі спецыялістаў па культурнай спадчыне і турызму[3]. У той жа час у краіне практычна адсутнічаюць працы, у якіх рабілася б філасофска-культуралагічнае асэнсаванне паняцця. Бадай адзіным выключэннем з'яўляецца культуралагічна-сацыялагічнае даследаванне, праведзенае Інстытутам сацыялогіі НАН Беларусі[4]. У большасці навуковых прац і нарматыўна-прававых дакументаў у нашай краіне аказваецца больш распаўсюджаным паняцце *гісторыка-культурная спадчына*.

---

[1] Мартыненко И. Э. Законодательство об охране историко-культурного наследия и прокурорский надзор за его исполнением. Минск, 2001; Его же. Правовая защита культурного наследия. Минск, 2003; Его же. Правовая охрана историко-культурного наследия. Гродно, 2005; Его же. Правовой статус, охрана и восстановление историко-культурного наследия. Гродно 2005; Несцярчук Л. М. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі : асноўныя этапы фарміравання, сучасны стан і перспектывы. Мінск, 2003.

[2] Сусветная культурная і прыродная спадчына World cultural and natural heritage : зб. матэрыялаў па афарм. дак. для ўключэння аб'ектаў у Спіс сусвет. культур. і прырод. спадчыны ЮНЕСКА / гал. рэд. Л. Ф. Анцух. – Минск , 2004.

[3] Артюшевская С. В., Колбаско А. Н. Модель подготовки менеджера по культурному наследию и туризму. Минск, 2003.

[4] Культурная спадчына ; пад навук. рэд. Э. К. Дарашэвіча ; НАН Беларусі, Ін-т сацыялогіі. Мінск, 2001.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Так, у Законе «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» гісторыка-культурная спадчына характарызуецца як сукупнасць найбольш адметных вынікаў і сведчанняў гістарычнага, культурнага і духоўнага развіцця народа Беларусі, увасобленых у гісторыка-культурных каштоўнасцях. У сваю чаргу гісторыка-культурныя каштоўнасці – гэта матэрыяльныя аб'екты (матэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці) і нематэрыяльныя праяўленні творчасці чалавека (нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці), якія маюць адметныя духоўныя, мастацкія і (або) дакументальныя вартасці і якім нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці [1].

На наш погляд, у вызначэнні гісторыка-культурнай спадчыны назіраецца некаторая таўталогія. Сапраўды, нават на інтуітыўным узроўні становіцца зразумела, спадчына – гэта нешта, што створана дастаткова даўно і засталося нам ад папярэдніх пакаленняў. Таксама характарызуецца і культурная спадчына, якая айчыннымі даследчыкамі вызначаецца як частка матэрыяльнай і духоўнай культуры, створанай мінулымі пакаленнямі. У яе ўваходзяць культурныя каштоўнасці, якія вытрымалі выпрабаванне часам і перадаюцца ад пакалення да пакалення як нешта важнае і каштоўнае. Такім чынам, частку *гісторыка-* ў вызначэнні можна лічыць лішняй.

Даволі часта навукоўцы гавораць аб тым, што культурная спадчына ідэалізуецца, акружаецца арэолам «вечных каштоўнасцей». Так, культурная спадчына становіцца сродкам згуртавання нацыі, аб'яднання яе ў крызісныя моманты [13, с. 141]. Як правіла, яе станоўчыя вынікі перабольшваюцца, а адмоўныя, наадварот, змяншаюцца, ці ўвогуле – замоўчваюцца.

Падводзячы вынік, адзначым, паняцце культурнай спадчыны прыйшло ў беларуска- і рускамоўную тэрміналогію з міжнароднай нарматыўна-прававой практыкі і сёння стала адным з базавых паняццяў культуралагічнай навукі. Яно з'яўляецца дастаткова маладым у навуковай практыцы, што абумовіла наяўнасць значнай колькасці вызначэнняў, і пошукі аптымальнай фармуліроўкі працягваюцца. У розныя эпохі ў яго ўкладвалі розны сэнс, які адлюстроўваў змену сацыяльна-эканамічных, ідэалагічных і культурна-адукацыйных парадыгмаў, адпавядаў тым устаноўкам соцыуму ў адносінах да культурнай спадчыны і дзейнасці па яе захаванні, якія пераважалі ў тую ці іншую культурную эпоху.

1. Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь : Закон Рэсп. Беларусь, 9 студз. 2006 г., № 98-З // Нац. прававы інтэрнэт-партал Рэсп. Беларусь [Электронны рэсурс]. – Мінск, 2012. – Рэжым доступу: http: //www.pravo.by/main.aspx?guid=3871&p0=h10600098&p2=. – Дата доступу: 31.08.2013.

2. *Баллер, Э. А.* Социальный прогресс и культурное наследие / Э. А. Баллер. – М. : Наука, 1987. – 225 с.

3. *Веденин Ю. А.* Необходимость нового подхода к культурному и природному наследию России / Ю. А. Веденин // Актуальные проблемы сохранения культурного и природного наследия : сб. науч. тр. / Рос. НИИ культур. и природ. наследия ; отв. ред. А. В. Каменец. – М., 1995. – С. 5–20.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*4. Дьячков, А. Н.* Культурное наследие / А. Н. Дьячков // Рос. музейная энцикл. : в 2 т. / гл. ред. А. А. Сундиева, сост.: М. М. Клеина, О. В. Кульбачевская. – М. : Прогресс : Рипол Классик, 2001. – Т. 2. – С. 312.

5. Ключевые понятия музеологии : пер. с фр. / сост.: А. Девалье, Ф. Мересс. – М. : ИКОМ России, 2012. – 101 с.

6. Конвенции и рекомендации ЮНЕСКО по охране культурного наследия : сб. / Белорус. фонд культуры, Науч.-техн. гос. предприятие «Белинформреставрация» ; сост. В. В. Глинник. – Минск : Журн. «Тыдзень», 2000. – 193 с.

7. Конвенция об охране всемирного культурного и природного наследия (Париж, 16 нояб. 1972 г.) // Свод нормативных актов ЮНЕСКО : Конвенции и соглашения, рекомендации, декларации / Комис. СССР по делам ЮНЕСКО ; сост. И. Д. Никулин. – М. : Междунар. отношения, 1991. – С. 290–302.

*8. Кулешова, М. Е.* Понятийно-терминологическая система «природное культурное наследие» : содержание и основные понятия / М. Е. Кулешова // Уникальные территории в культурном и природном наследии регионов : сб. науч. тр. / М-во культуры Рос. Федерации, Рос. акад. наук, Рос. НИИ культур. и природ. наследия ; отв. ред. Ю. Л. Мазуров. – М., 1994. – С. 40–46.

*9. Лапцэвіч, Л. Г.* Помнік / Л. Г. Лапцэвіч // Беларус. энцыкл. : у 18 т. – Мінск : БелЭн, 2001. – Т. 12. – С. 504–505.

*10. Лихачев, Д. С.* Декларация прав культуры и ее международное значение / Д. С. Лихачев // Площадь Д. С. Лихачева [Электронный ресурс]. – 2013. – Режим доступа: http://www.lihachev.ru/deklaratsiya/123/. – Дата доступа: 31.08.2013.

*11. Мастеница, Е. Н.* Культурное наследие в современном мире : концептуализация понятия и проблематики / Е. Н. Мастеница // Мировая политика и идейные парадигмы эпохи : сб. ст. / С.-Петерб. гос. ун-т культуры и искусств. – СПб. : СПбГУКИ, 2008. – С. 252–262.

*12. Ожегов, С. И.* Толковый словарь русского языка : ок. 100 000 слов, терминов и фразеол. выражений / С. И. Ожегов ; Рос. акад. наук, Ин-т рус. яз. им. В. В. Виноградова. – М. : Азбуковник, 2009. – 1360 с.

*13. Суша, А. А.* Змест і сутнасць паняцця «культурная спадчына» / А. А. Суша // XI Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвеч. Дням славянскага пісьменства і культуры, Мінск, 24–26 мая 2005 г. : матэрыялы чытанняў / рэдкал.: М. А. Бяспалая (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2006. – С. 139–144.

*14. Prott, L. V.* Problems of Private International Law for the Protection of the Cultural Heritage Recueil des Cours / L. V. Prott. – Hague : Academic de Droit, 1989. – Vol. 5. – P. 224–317.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*I . BAMBESHKA*

## THE EVOLUTION, CONTENTS AND ESSENCE OF THE NOTION «CUTURAL HERITAGE»

*The article deals with current issues of cultural heritage. In particular, considerable attention is paid to the evolution of the concept of «cultural*

*heritage». The choice of a theme is made due to the lack of similar studies in the Belarusian scientific practice. The author examines the evolution of the concept, holds the historiographical analysis of the problem of its definition.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 26.09.2013.

УДК 069+347.78

*Ю. Н. БЕСПАЛЫЙ*

## АВТОРСКОЕ ПРАВО В МУЗЕЙНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ: К ПОСТАНОВКЕ ВОПРОСА

*Освещаются виды музейной деятельности, основанные на создании и использовании произведений – объектов авторского права. Их надлежащее правовое регулирование, определение субъектов, содержания правоотношений являются малоизученной областью права. Учитывая особую роль музеев в создании и развитии цивилизованного общества, автор считает необходимым рассмотреть особенности музейной деятельности с точки зрения авторского права. Исследование проведено в рамках задания «Разработать научно-методические рекомендации внедрения современных музееведческих технологий в деятельность региональных музеев Беларуси» Государственной программы «Культура Беларуси» на 2011–2015 годы.*

Со стороны общества и государства авторскому праву уделяется все больше внимания. Однако такая тенденция обусловлена прежде всего коммерческими интересами правообладателей, т.е. тех, кто владеет рынком развлекательной индустрии. К сожалению, некоммерческая сторона применения авторского права в социокультурных целях либо применение в малоприбыльных сферах социокультурной деятельности сводится к констатации факта наличия авторского права того или иного субъекта на некий созданный/переработанный им предмет объективного мира. Изменение мировоззрения общества, обращение человечества к индивидуальности и развитие научно-технического прогресса требуют определения оснований, границ авторского права в различных сферах жизни. Представляется, что деятельность музеев незаслуженно обойдена вниманием как со стороны законодателя, так и доктрины авторского права.

Для определения границ распространения авторского права в музейной деятельности необходимо уточнить подходы к пониманию музейного феномена. «Подходы могут быть различны: через концептуальный подход (музей, наследие, институт, общество, этика, музеальность), посредством теоретических и практических соображений (музеология, музеография), с помощью его функций (предмет, коллекция, музеефикация), через его “участников” (музейные специалисты, публика) или посредством ведущей деятельности (хранение, исследование, коммуникация, образование, выставочная деятельность, интерпретация, менеджмент, архитектура)» [2, с. 21]. Из перечисленного следует, что музеология не касается вопросов авторских прав на объекты, которые используются либо создаются в музейной деятельности. Так, в Законе «О музеях и Музейном фонде Республики Беларусь» нет норм, регулирующих вопросы авторского права [1].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ